ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
7
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 13 (1389)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### УРАЧЫСТЫЯ ВЕЧАРЫ

**замежных студэнтаў прайшлі ва універсітэце. Яны былі прысвечаны 49-й гадавіне заснавання Камуністычнай партыі Ірака і 27-й гадавіне незалежнасці Судана. Акрамя студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта, на вечары прысутнічалі прадстаўнікі політэхнічнага інстытута, інстытута народнай гаспадаркі.**

**М. АЛЬ-РАУХАНІ,**
**член інтэрпрэс-цэнтра.**

### У ГАСЦЯХ

**у студэнтаў механіка-матэматычнага факультэта пабывалі вучні 9—10-х класаў Клецкага дзіцячага дома. Для школьнікаў былі арганізаваны экскурсіі па факультэту, на вылічальны цэнтр, сустрэчы з выкладчыкамі. Разам са сваімі старэйшымі сябрамі клецкія школьнікі наведалі выстаўкі, музеі, тэатры сталіцы.**

**В. ЖУК,**
**сакратар камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта.**

### НА ПАСЯДЖЭННІ

**прэзідыума прафкома супрацоўнікаў ішла гаворка аб рабоце прафсаюзнага бюро ФПМ, фізічнага і юрыдычнага факультэтаў па далейшаму ўмацаванню працоўнай дысцыпліны і па ўзмацненню барацьбы з парушэннямі законнасці і праяўленнямі безгаспадарчасці.**

**Асобна спыніліся на ходзе выканання мерапрыемстваў па рэалізацыі крытычных заўваг, выказаных на факультэцкіх справаздачна-выбарных прафсаюзных сходах у 1982 годзе.**

**Я. СВІРСКІ,**
**член арганізацыйна-масавай камісіі прафкома супрацоўнікаў.**

### КАШТОЎНЫЯ ПАДАРУНКІ

**перадалі студэнты факультэта журналістыкі дзіцячаму дому № 2 г. Мінска. Абрадуецца дзетвара прыгожым сукенкам і рознакаляровым фламастэрам, альбомам для малявання і іншым падарункам. Дарэчы, грошы на іх студэнты зарабілі на суботніках.**

**А. НЕЖАВЕЦ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.**



РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!

## Адказнасць перад часам

*У камітэце камсамола механіка-матэматычнага факультэта рэдка калі не застанеш студэнтаў. Цяпер — тым больш: у «зеніце» семестр, ідзе агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці універсітэта, завяршаецца фарміраванне будаўнічых атрадаў... «Штаб» жыве, дзейнічае, працуе. Таму і рашылі мы перш-наперш зазірнуць сюды. І не памыліліся: наш «герой» сядзеў за сталом з таблічкай «дзяжурны па камітэту камсамола» і нешта старанна запісваў у сшытак.*

*— Як бачыце, сёння я дзяжурны. А пакуль ёсць вольная хвіліна, рашыў паўтарыць учарашнюю лекцыю па метадах аптымізацыі. Калі вас нешта цікавіць — пытайцеся...*

*Мы крыху ведалі пра свайго «героя». Ведалі, што завуць яго Сяргеем, прозвішча— Васілец. Ведалі, што займаецца ён на чацвёртым курсе. выдатнік вучобы, узначальвае ваенна-патрыятычны сектар камітэта камсамола мехмата, душа любога калектыву...*

*— Сапраўды? — здзівіўся Сяргей.— А я, уявіце, нават і не здагадваўся пра апошняе.*

*І ўжо сур'ёзным тонам дадаў:*

*— Час не здымае з камсамольцаў адказнасці за любую справу — ці то за вучобу, ці за грамадскую работу. Наадварот, з кожным днём яна ўзрастае — перад грамадствам, перад таварышамі, перад сабой...*

*Адкуль жа ў Сяргея Васільца такі — не інакш, як дыялектычны — пункт погляду на жыццё? Юнаку ж крыху больш дваццаці, а тут важкія словы — «адказнасць за даручаную справу», «адказнасць перад грамадствам». Мы схільны меркаваць, што многае — ад выхавання і самавыхавання. Як і прызванне — дакладныя навукі.*

*Імі Сяргей захапіўся зусім не выпадкова. Маці яго, Настасся Георгіеўна, шмат гадоў выкладае матэматыку ў сярэдняй школе. А яблык ад яблыні, як кажуць, недалёка падае. У даным выпадку — у добрым сэнсе слова. Спачатку былі ў Сяргея школьныя алімпіяды па матэматыцы, затым раённыя. І, нарэшце, мехмат БДУ.*

*Аднак вучоба, згадзіцеся, яшчэ не ўсё, хаця адносіны да яе — ужо пазіцыя. Акрамя ўсяго сказанага, Сяргей яшчэ і актыўны будатрадавец: працаваў у Мінску, у Карэліі, у Хабараўскім краі. Сёлета таксама збіраўся паехаць на будоўлю, ды асабістыя справы не дазваляюць. Шкада: не будзе хапаць атраду веселуна і гаваруна Сяргея Васільца.*

*Ну, а каб больш-менш поўным было наша ўяўленне пра Сяргея, адзначым, што любіць ён кнігі, захапляецца музыкай, калекцыяніруе пласцінкі...— таксама пазіцыя. Але пра гэта — наступным разам.*

*А. ФАМІЧОЎ.*

ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА СЕМЕСТРА

## Працяг традыцыі

ПРЫЕМНА, калі побач сябры, калі радасці і непрыемнасці агульныя. Вось іменна такое пачуццё локця, калектывізму адчулі байцы СБА імя Г. Дзімітрава гістарычнага факультэта. Камуністычны інтэрнацыянальны — так з гонарам называюць студэнты свой атрад. Фарміраванне яго — працяг добрага пачынання, асабістай ініцыятывы студэнтаў гістарычнага.

Напружаны рытм працы, атрадныя лінейкі, мерапрыемствы, што зблiжаюць людзей, — усё гэта яшчэ наперадзе. Але ўжо зараз байцоў хвалююць пытанні, звязаныя з асаблівасцямі работы, формамі правядзення адпачынку, станам маральна-псіхалагічнага клімату ў інтэрнацыянальным атрадзе. На гэтыя і іншыя пытанні ахвотна адказваў «навічкам» былы камандзір атрада Віктар Шадурскі.

Касцяк атрада — студэнты II курса аддзялення гісторыі, якія ведаюць адзін аднаго не толькі па скупых радках характарыстык, але і па вучобе, грамадскай рабоце. Так, пры выбары майстра атрада незамяняльнай кандыдатурай аказаўся Мікалай Паўлючэнка. Як заўсёды, Слава Аляксеенка аднадушна быў абраны рэдактарам насценнай газеты. Слава Кулік — фатограф. Не без яго ўдзелу афармляюцца фотагазеты, у якіх адлюстроўваецца правядзенне ў будаўнічых арганізацыях суботнікаў. Словы падзякі часта можна пачуць у адрас Люды Рэчыц і Рыты Сіцько, якія шмат добрых спраў зрабілі для выхаванцаў дзіцячага дома № 2 па вуліцы Каліноўскага.

Новы працоўны семестр дзімітраўцы сустракаюць у поўнай баявой гатоўнасці.

**А. ДРОЗД,**
**баец СБА імя Г. Дзімітрава, слухачка аддзялення журналістыкі.**

## ТЫ ГАТОЎ ДА ПАЛІТЗАЛІКУ?

**7 красавіка ў камсамольскай арганізацыі універсітэта пачынаецца палітзалік, які з'яўляецца адной з форм Ленінскага заліку, важным этапам падрыхтоўкі да грамадска-палітычнай атэстацыі.**

XXVI З'ЕЗД КПСС паставіў перад камсамольскімі арганізацыямі задачу ўзмацніць работу па фарміраванню ў моладзі камуністычнага светапогляду, выпрацоўцы ў яе глыбокага разумення палітыкі КПСС, патрэбнасці пастаянна авалодваць марксісцка-ленінскай тэорыяй. Важным этапам падрыхтоўкі да грамадска-палітычнай атэстацыі, формай сумеснай дзейнасці камсамольскіх арганізацый і кафедраў грамадскіх навук нашага універсітэта з'яўляецца палітзалік, які ў гэтым годзе будзе праходзіць з 7 да 22 красавіка — напярэдадні 113-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна.

Дзейнасць выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў зараз немагчыма ўявіць у рамках вузкай спецыяльнасці. Для маладых спецыялістаў ВНУ становіцца не толькі першай ступенькай прафесійнага росту, але і першым крокам на шляху да палітычнай культуры, грамадзянскай сталасці. У час палітзаліку, аналізуючы пытанні палітыкі КПСС і Савецкага ўрада, канкрэтныя падзеі сучаснага жыцця, камсамольцы на практыцы выкарыстоўваюць і замацоўваюць веды, атрыманыя пры вывучэнні грамадскіх дысцыплін. Адной з задач, якія вырашаюцца ў ходзе палітзаліку, з'яўляецца актывізацыя ўдзелу кожнага камсамольца ў рабоце сваёй камсамольскай арганізацыі, і, як вынік, фарміраванне ў студэнтаў навыкаў грамадска-палітычнай і арганізацыйнай работы.

Трэба адзначыць, што мэта палітзаліку — не толькі перыядычная праверка ведаў камсамольцаў, але перш за ўсё арганізацыя сістэматычнага вывучэння твораў класікаў марксізму-ленінізму, дакументаў КПСС, матэрыялаў па знешняй і ўнутранай палітыцы Савецкай дзяржавы, гісторыі ВЛКСМ і міжнародных маладзёжных арганізацый і саюзаў. Галоўная роля тут належыць камсамольскай арганізацыі групы. Зацікаўленасцю кожнага камсамольца ў арганізацыі грамадска-палітычнай работы ў групе, уменнем камсамольскіх важакоў нешаблонна падыходзіць да правядзення традыцыйных мерапрыемстваў і заўсёды шукаць новыя формы работы вызначаецца яе дзейнасць і эфектыўнасць.

Кансультацыі з выкладчыкамі кафедр грамадскіх навук, падрыхтоўка студэнтамі групы паведамленняў па найбольш важных і складаных пытаннях, абмеркаванне іх пры ўдзеле выкладчыкаў сацыяльна-эканамічных дысцыплін і прафесійных лектараў павінна стаць неад'емнай часткай арганізацыі палітзаліку. Правядзенне яго ў форме палітдыскусій дазваляе ацаніць веды ўдзельнікаў заліку, іх актыўнасць, ідэйную перакананасць і, галоўнае, здольнасць прымяняць веды па марксісцка-ленінскай тэорыі пры аналізе канкрэтных падзей і з'яў сучаснасці, уменне выкарыстоўваць тэарэтычныя веды ў сваёй грамадскай рабоце.

**Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
**кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.**

# КАФЕДРА ТРЫМАЕ ПЕРШЫНСТВО

**● ФОТАРЭПАРТАЖ ●**

*НА ЗДЫМКАХ: пяцікурснікі Сяргей Жураўлёў і Уладзімір Паўлаў вядуць вывучэнне алмазаў радыёскапічным метадам; кандыдата фізіка-матэматычных навук, старшага навуковага супрацоўніка Марыю Іосіфаўну Тарасік ведаюць на кафедры не толькі як вучонага. Яна — прафорг кафедры; у чацвёртакурснікаў ідзе спецпрактыкум па фізіцы паўправадніковых прылад.*



*КАФЕДРА ФІЗІКІ ПАЎПРАВАДНІКОЎ існуе 16 гадоў. Акрамя вучэбных і даследчых лабараторый, кафедра мае філіял на вытворчым аб'яднанні «Інтэграл». Частка студэнтаў, пачынаючы з 3-га курса, праходзіць там практыку, рыхтуе курсавыя і дыпломныя работы, якія вызначаюцца грунтоўнасцю даследаванняў, распрацоўкай перспектыўных тэм. Прыйшоўшы на прадпрыемства пасля заканчэння універсітэта, былыя студэнты кафедры тут ужо не навічкі, а вопытныя спецыялісты, якія дасканала ведаюць вытворчасць.*

*Другая частка студэнтаў кафедры праходзіць навуковую і вытворчую практыку ў навукова-даследчых інстытутах. Гэта дазваляе на высокім узроўні трымаць студэнцкую навуку: штогод 80 працэнтаў дыпломных работ рэкамендуецца да ўкаранення ў вытворчасць ці да публікацыі. Гэта вельмі высокі і вельмі важны паказчык. Нездарма НДІ рэспублікі з ахвотай сустракаюць практыкантаў кафедры фізікі паўправаднікоў. даяраюць ім важныя заданні.*

*— Умоўна члены кафедры раздзяляюцца на навуковых супрацоўнікаў і выкладчыкаў, — гаворыць загадчык кафедры Вячаслаў Фаміч Стэльмах, — але гэта толькі ўмоўна. Выкладчыкі ўдзельнічаюць у навуковай рабоце, а навуковыя супрацоўнікі чытаюць лекцыі, вядуць лабараторныя заняткі. З пяцідзесяці супрацоўнікаў кафедры толькі трое не маюць навуковых ступеней. Два асістэнты будуць абараняцца ўжо ў гэтым годзе.*

*А вось гэты тэлевізар перад вамі — узнагарода за першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве. Дарэчы, фізічны факультэт чацвёрты год запар трымае першынство ва універсітэце, а мы ўвесь гэты час — першыя на факультэце.*

**В. ШАЧАК.**
Фота **аўтара.**





# ДЗЕНЬ МАЦІ

МАМА! Самае дарагое і блізкае сэрцу кожнага чалавека слова. «Мама» — першае слова, якое гаворыць дзіця яшчэ ў калысцы, ці яно рускае ці арабскае, нарадзілася ў Афрыцы ці Лацінскай Амерыцы. І справа не ў тым, на якой мове мы вымаўляем гэтае слова. Няма больш ласкавага, пяшчотнага, даражэйшага і дабрэйшага чалавека.

Маці аддае ўсе свае сілы, любоў і пяшчоту выхаванню дзіцяці. Выхоўваць жа дзяцей нашым маці, жанчынам з Іарданіі, Амана, Палясціны і многіх іншых арабскіх краін, намнога цяжэй.

Доўгі час арабская жанчына не ведала, што такое свабода і раўнапраўе. Яна была наогул пазбаўлена ўсіх правоў, і яе адзіным удзелам былі дамашняя работа, выхаванне дзяцей. Яна не мела нават права выбраць сабе мужа, а выходзіла замуж за таго, хто больш грошай заплаціць яе бацькам.

Так жылі нашы жанчыны пад прыгнётам сям'і і грамадства. Вайна і разбурэнні прыносілі ім гора і пазбаўлялі шчасця.

І ў XX стагоддзі чорныя сілы імперыялізму імкнуцца пазбавіць нашых маці, жонак і сясцёр радасці жыцця. Але цяпер нашы жанчыны побач з мужчынамі пачалі барацьбу за свабоду і незалежнасць сваёй радзімы, за шчасце сваіх дзяцей. Яны выступаюць з трыбун усіх прагрэсіўных арганізацый, розных міжнародных форумаў. Яркі прыклад таму — барацьба арабскіх жанчын за свабоду Палясціны, Амана і іншых краін.

Есць вясной адзін дзень, які стаў сімвалам барацьбы за вызваленне і шчасце нашых жанчын. Гэта — Дзень маці.

Ці хопіць ва ўсіх мовах свету слоў, каб выказаць пачуцці да нашай маці?!

Лёс маёй маці — гэта біяграфія цэлага пакалення палясцінцаў. Калі памёр мой бацька, яна засталася з семярыма дзецьмі на руках. Старэйшаму было адзінаццаць гадоў, малодшаму — два, і маці не магла выйсці на работу. І не было ніякіх законаў на баку жанчыны з дзецьмі. А тут яшчэ ў 1967 годзе пачалася вайна, і наш горад быў захоплены. Пачаліся арышты, забойствы старых і дзяцей. «Мае сыны яшчэ вельмі маленькія», — ціха шаптала пра сябе мама.

Ішоў час... Памятаю, праз сем гадоў, аднойчы ноччу, ворагі ўварваліся ў наш дом, каб арыштаваць старэйшага брата. Я сачыў за мамай, я баяўся, што яна пачне плакаць. А яна глядзела, як звязваюць яе сына, як разбураюць наш дом, і нібы застыла. Потым яна перавяла погляд на звязанага брата і спакойна паглядзела яму ў вочы. І гэтым поглядам яна перадала яму сваю вытрымку, сваю мужнасць, сваю веру ў перамогу...

Калі я ад'язджаў, яна сказала мне на развітанне зусім нямнога: «Едзь! Вучыся жыццю ў самога жыцця»...

Добра вядомы імёны Далал аль-Макрабі, Лелі Халід, Муны Алі, Фатамы Алашыты і многіх іншых мужных арабскіх жанчын, якія актыўна змагаюцца за свабоду сваіх краін. І ім надае сілы ўсведамленне таго, што яны не адны: побач з імі ўсе жанчыны свету, усё прагрэсіўнае чалавецтва.

**НАБІЛЬ АЛЬ ХАЦІБ (Палясціна), СУХЕЛЬ САЛЕМ СААД (Аман), НОУЗАД ФУАД АМАРЫН (Іарданія),**
**члены інтэрпрэсцэнтра.**

# ПАДРЫХТОЎКА НАСТАЎНІЦКІХ КАДРАЎ

# ПАВАЖАЦЬ АСОБУ ВУЧНЯ

*Канферэнцыя на тэму «Выкарыстанне педагагічнай спадчыны В. А. Сухамлінскага ў вучэбна-выхаваўчым працэсе» адбылася на педагагічным патоку трэцяга курса хімічнага факультэта.*

Вялікія людзі заўсёды пераймаюць багаты вопыт сваіх папярэднікаў. В. А. Сухамлінскі, вядомы савецкі педагог, не толькі выкарыстаў усё лепшае, што было ўнесена ў педагагічную навуку перадавымі настаўнікамі чалавецтва, а абдумаў і развіў, перанёс на спрыяльную глебу савецкай педагогікі. Рэфрэнам дзейнасці Сухамлінскага-педагога была думка аб неабходнасці выхавання ў вучняў камуністычнай ідэйнасці і мэтанакіраванасці. Гэта было адзначана ва ўступным слове в. а. дацэнта кафедры педагогікі Л. А. Савацеевай.

Далей былі заслуханы цікавыя даклады пра жыццё і дзейнасць В. А. Сухамлінскага. З біяграфіяй вялікага педагога пазнаёміла прысутных Людміла Казлоўская. Усе трыццаць гадоў ён працаваў у Паўлышскай сярэдняй школе. Стаў Героем Сацыялістычнай Працы, членам-карэспандэнтам Акадэміі педагагічных навук СССР, заслужаным настаўнікам УССР. Абагульняючы вопыт сваіх папярэднікаў, калег і свой асабісты багаты вопыт, Васіль Аляксандравіч напісаў больш як 30 кніг і шмат артыкулаў для часопісаў.

Галоўнай задачай савецкага педагога В. А. Сухамлінскі лічыў фарміраванне асобы камуністычнага тыпу. Некаторыя аспекты гэтай праблемы былі разгледжаны ў выступленні Ірыны Шушлябінай. В. А. Сухамлінскі ўказваў, што настаўнікі павінны выхоўваць у вучняў любоў да Радзімы, пралетарскі інтэрнацыяналізм, калектывізм і прынцыповасць.

Разам з гэтым В. А. Сухамлінскі вялікую ўвагу ўдзяляў і асобе самога настаўніка. Гэтая праблема актуальная і па сённяшні дзень. Яе раскрыла ў сваім выступленні Таццяна Мозаль. Як адзначалася ў дакладзе Валянціны Войчанка, вучань павінен зразумець і выправіць сваю памылку. Слова настаўніка не павінна разыходзіцца са справай. Трэба памятаць, што ад яго чуласці, дабраты і даверу залежыць поспех выхавання.

Навучыць дзяцей захапляцца, здзіўляцца, бачыць новае і прыгожае, паказаць ім прыгажосць і радасць працы, выхаваць любоў да Айчыны, да яе прыроды. Гэтыя задачы вырашаюцца педагогікай, і вырашэнне іх прывядзе да выхавання чалавека, які будзе берагчы і любіць прыроду, радавацца жыццю, быць шчаслівым у працы. Галіна Маркава, спыніўшыся на гэтым баку педагагічнай дзейнасці В. А. Сухамлінскага, адзначыла, што ён лічыў прыгажосць і розум непадзельнымі.

У заключэнне быў заслуханы даклад Святланы Ашмянскай, у якім яна паказала работу В. А. Сухамлінскага з бацькамі.

Падводзячы вынікі сказанага, можна адзначыць, што значэнне педагагічнай спадчыны В. А. Сухамлінскага для савецкай педагогікі цяжка пераацаніць. Сэнс гэтай канферэнцыі ў тым, каб навучыць нас, будучых педагогаў, выкарыстоўваць багаты вопыт настаўніка ў сваёй працы.

**Г. МАСКАЛЕНКА,**
**студэнт хімічнага факультэта.**

# ПРА ЧЛЕНСКІЯ ЎЗНОСЫ І... ПАМЫЛКІ

НЯДАЎНА рэвізійная камісія прафкома правяла праверку на ўсіх факультэтах універсітэта. Яе мэта — праверыць правільнасць выплаты членскіх узносаў.

У прыватнасці, недахопы выявіліся на хімічным факультэце. Студэнтка 4-й групы 3-га курса Наталля Ліпніцкая значыцца ў спісах дэканата як студэнтка, якая атрымлівае стыпендыю. Плаціць жа ўзносы, як і ўсе тыя, хто без стыпендыі.

Наадварот склалася сітуацыя ў студэнта 4-й групы 2-га курса Бялова. Каму ж ў такім выпадку верыць? На астатніх факультэтах такіх недахопаў не заўважана, але ж групы правяраліся выбарачна.

Вывад адзін: будзьце больш уважлівымі, таварышы прафоргі!

**Ж. ПЯТКЕВІЧ.**

# У прызёрах

ПРАЙШЛА КАНФЕРЭНЦЫЯ Мінскага гарадскога савета таварыства выратавання на вадзе, дзе была адобрана дзейнасць пярвічнай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна, якая па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за 1982 год заняла 3-е месца.

Таварыства выратавання на вадзе ахоплівае амаль тры чвэрці ўсіх супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта. Работы хапае, і не толькі па распаўсюджванню марак, як часам лічаць. У калектыве праводзяцца растлумачальныя гутаркі аб мерах бяспекі на вадзе. Штогод студэнты геаграфічнага і біялагічнага факультэтаў праходзяць летнюю вучэбную практыку на азёрах і вадасховішчах. Каб пазбегнуць няшчасных выпадкаў, у раёнах правядзення практык арганізаваны спецыяльныя пасты. Для эфектыўнай работы такіх пастоў патрабуецца адпаведнае абсталяванне, якое і набывае таварыства, дарэчы, і за кошт сродкаў ад членскіх узносаў. У 1982 годзе ва універсітэце сумесна з кафедрай фізвыхавання навучаны плаванню 500 чалавек. Арганізавана група па навучанню плыўцоў-аквалангістаў. У летні перыяд яны будуць дзяжурыць у зоне адпачынку «Дразды», якая замацавана за Маскоўскім раёнам г. Мінска.

Па рэзультатах работы пярвічнай арганізацыі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна лепшыя члены таварыства былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі рэктарата.

**Н. ВАСІЛЬЕВА.**

● **АЛЁ, ІНТЭРНАТ!**

# Твой вольны час—тваё багацце

ІНТЭРНАТ № 4 знаходзіцца на адной з самых прыгожых вуліц горада. Побач кінатэатр «Масква», Палац спорту. Здаецца, праблемы, як правесці вольны час, для студэнтаў юрыдычнага і хімічнага факультэтаў не існуе. І ўсё ж...

У той дзень, калі я прыйшла ў інтэрнат, большасць студэнтаў былі дома. Дзяўчаты з першага курса хімічнага факультэта Л. Машкова, С. Шыманская, А. Мышкарова, Т. Корсак, Л. Паддубная выпускалі нумар насценнай газеты. У ленінскім пакоі ішлі шахматныя баі. У Мікалая Карбалевіча, былога старшыні студсавета, а цяпер каменданта інтэрната, свае справы. Калі я пачынала гаворку аб тым, як жывуць студэнты, як праводзяць вольны час, то чула станоўчыя адказы. Але з размовы з камендантам я даведалася, што тут яшчэ шмат нявырашаных праблем.

Самая папулярная форма адпачынку для студэнтаў — дыскатэка. Толькі тут таксама не ўсё гладка. Уласнай апаратуры інтэрнат не мае. Па чарзе прыводзяць то з хімічнага, то з юрыдычнага факультэтаў. На чым прывозяць? На таксі. Але, згадзіцеся, гэта не выхад са становішча.

Дыскатэка праводзіцца ў падвале інтэрната, які студэнты жартам называюць «мармуровай залай». Ды толькі ні змрочныя сцены, ні маленькія вокны не адпавядаюць назве. Праўда, у Мікалая Карбалевіча і ў Мікалая Разанцава, старшыні студсавета, аптымізму хоць адбаўляй: пафарбавалі сцены, у вокнах зіхацяць каляровыя шкельцы. А мастак інтэрната В. Яфімаў намалюе на сценах прыгожыя малюнкі. Дарэчы, у мінулым годзе ён размаляваў куток калідора, які стаў для жыхароў выдатным месцам адпачынку. Там і сапраўды цудоўна: стройныя бярозы, рака, сонца садзіцца за лесам... І асвятленне там незвычайнае зрабілі, і мэбля мяккая была. Чаму была? Таму, што ёсць яшчэ, на жаль, сярод студэнтаў такія, што жывуць па прынцыпу — «ламаць — не будаваць».

Вельмі любіць расказваць Мікалай Карбалевіч аб спартыўных дасягненнях інтэрната. У мінулым навучальным годзе ўпершыню праводзілася спартакіяда сярод інтэрнатаў БДУ. Інтэрнат № 4 стаў чэмпіёнам. Пераможцам былі абяцаны ўзнагароды: кубкі, прызы, граматы. Але чакаюць іх студэнты і сёння. Не да твару дарослым людзям гуляць у абяцанкі. Хочацца верыць, што ў гэтым годзе студэнты ўсё ж атрымаюць свае ўзнагароды, а арганізацыя спаборніцтваў будзе лепшай.

У інтэрнаце № 4 ёсць свая спартыўная зала (у іншых яе няма). Аляксандр Неабердзін, студэнт 2-га курса юрыдычнага факультэта, старшыня спартыўна-аздараўленчай камісіі і яго сябры, тыя, хто любіць спорт, сваімі рукаміператварылі падвал у спартыўную залу, хаця зрабіць гэта было нялёгка.

Калі мы падышлі да дзвярэй ленінскага пакоя, я падумала, што там нікога не будзе Але я памылілася. Дзяжурны быў на месцы, а жыхары збіраліся глядзець тэлеперадачу. На стале — акуратна пакладзеныя падшыўкі газет, а ў шафе стаяць творы Леніна. Гэта гады чатыры назад была тут добрая традыцыя: студэнты збіралі сваю бібліятэчку. На жаль, традыцыя існавала не доўга, а ў шафе сіратліва засталіся стаяць дзесяткі два кніг.

Часта ў ленінскім пакоі чытаюць лекцыі. Неахвотна ідуць на іх студэнты. Чаму? Выкладчыкі прыходзяць са сваімі тэмамі, якія не заўсёды па густу студэнтам. Ды толькі каб самім прапанаваць тэму лекцыі —такога яшчэ не было. А, скажам, чаму б культурна-выхаваўчай камісіі не распрацаваць тэму разам з лектарам, каб і выкладчыкам, і студэнтам было цікава.

Так, праблем шмат. Але вядома, што вырашаць іх трэба самім студэнтам. Верыцца, што сярод іх ёсць сапраўдныя энтузіясты, якія мараць зрабіць інтэрнат сваім другім домам, а жыццё студэнтаў — цікавым і разнастайным.

**Ж. ЖМАЙЛІК,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



*Пра такіх людзей гавораць: майстар—залатыя рукі. За што ні возьмецца — усё выканае. І не абы-як, а зробіць так, што прыемна паглядзець на дэталь. Нездарма давяраюць яму самыя адказныя аперацыі. Не першы год працуе ў спецыяльным канструктарска-тэхналагічным бюро з вопытнай вытворчасцю Віктар Міхайлавіч Сцяпанаў. Ён — фрэзероўшчык 6 разраду, ударнік камуністычнай працы.*

Фота **В. Шачака.**

# ЗНАЧЭННЕ МАЕ КОЖНЫ ШТРЫХ

## ТАБЕ, НАСЦЕНГАЗЕТЧЫК!

**По заданню рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт» быў праведзены рэйд-агляд трох факультэцкіх насценных газет: «Слова філолага», «Савецкі юрыст» і «Хімік», якія з'яўляюцца органамі партбюро, дэканатаў і камітэтаў камсамола адпаведных факультэтаў. У выніку рэйду быў сабраны значны матэрыял для крытычнага артыкула.**

АЛЕ АПОШНІ ТАК І НЕ АТРЫМАЎСЯ. Праглядаючы зробленыя запісы, раптам падумалася: паявяцца заўвагі — тут таго не хапае, там — гэтага, недзе яшчэ нешта недакладна зроблена. А каму гэта дапаможа? Выпускам насценак часцей за ўсё займаюцца энтузіясты, якія маюць не так багата спецыяльных ведаў, а кола праблем, якія стаяць перад імі, бадай што ненамнога меншае, чым кола саміх чытачоў...

Наогул, якой павінна быць насценная газета? Можа невялікай, стрыманай па характару матэрыялаў, як «Савецкі юрыст»? Ці—поўная супрацьлегласць—эмацыянальнай, святочных фарбаў, як «Слова філолага»? Ці такой, як «Хімік», што займае паміж імі сярэдняе становішча?

Каб пераканаўча адказаць на ўсе пытанні, я звярнуўся да спецыяльнай літаратуры.

Але перш за ўсё хацелася б высветліць, якія агульныя функцыі павінна выконваць факультэцкая насценная газета? Якія яе канкрэтныя задачы?

Іх шмат. На ёй ляжыць абавязак адгукацца на пытанні вучэбнай і навуковай дзейнасці, патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання, развіцця фізкультуры і спорту і інш. Ёй неабходна ўсебакова асвятляць жыццё партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый, прывіваць пачуццё мастацкага густу, фарміраваць актыўную жыццёвую пазіцыю ў студэнтаў. Яна павінна выкрываць недахопы і намячаць канкрэтныя шляхі пазбаўлення ад іх. Прыгадаем вядомыя ленінскія словы аб тым, што газета павінна стаць не толькі калектыўным прапагандыстам і агітатарам, але і калектыўным арганізатарам.

Як бачна, насценная газета выконвае тыя ж палітычныя функцыі, што і ўвесь наш друк. Розніца тут, бадай, толькі ў маштабах.

**Вось якія агульныя заўвагі засталіся ў маім блакноце пасля заканчэння рэйду-праверкі:**

**— газеты недастаткова эфектыўна выкарыстоўваюць фотаздымкі. Можна ўбачыць самыя неверагодныя «мантажы», калі наогул розныя па сваёй прыродзе мастацкія сродкі спрабуюць выкарыстаць як адно цэлае. У другіх выпадках, калі патрабуецца наглядна праілюстраваць думку, здымкаў няма. Часта цэлыя выпускі выходзяць без адзінага фотаздымка;**

**— маюць месца няўважлівыя адносіны да аўтараў: не ўказваюцца займаемыя імі пасады, калі гэта выкладчыкі або супрацоўнікі, курс, калі гэта студэнты;**

**— не мае сэнсу ператвараць газету ў стракаты калейдаскоп. «Пярэстасць» газетнай паласы, якая часцей за ўсё абцяжарвае апошнюю яе частку—«адлёт», не спрыяе таму, каб чытач уважліва прачытаў усе матэрыялы;**

**— не дапамагае чытачу і рэдакцыйная блытаніна паміж загалоўкам і рубрыкай. Апошняя чамусьці нярэдка выступае ў ролі першага;**

**— не заўсёды ўмела выдзяляецца галоўны, вядучы матэрыял нумара;**

**— самі рэдактары блытаюць паняцці «падборка матэрыялаў па тэме» і «пастаянная рубрыка»;**

**— часта не прымаюцца пад увагу «каардынатныя» звесткі газеты: дата выпуску, нумар, састаў рэдкалегіі.**

Такія недахопы ў большай ці меншай ступені ўласцівы ўсім тром насценкам. Да гэтага хацелася б дадаць наступнае. У газеты «Слова філолага» да гэтай пары яшчэ няма свайго стэнда. Вывешваецца яна на тую ж дошку, дзе размяшчаюцца розныя паведамленні. Пры гэтым мастаку газеты кожны раз патрэбна занава пісаць на асобным (і даволі значным па памерах) аркушы назву. Праўда, у такой зменнай назвы ёсць сваё «за»: яна кожны раз па-новаму звяртае на сябе ўвагу. Але ж трэба думаць таксама пра час і сілы мастака.

«Савецкі юрыст» мае сваё добра абсталяванае месца. Але здзіўляе іншае: яго плошча. На стэндзе тых памераў, якія адведзены для «Савецкага юрыста», можна змясціць толькі тры-чатыры разгорнутыя артыкулы. А калі ўлічыць, што газета абнаўляецца раз у месяц, то гэта малавата.

Яшчэ адно сур'ёзнае пытанне. Калі з дзвюма першымі газетамі актыўна супрацоўнічаюць выкладчыкі, прадстаўнікі партыйных бюро і камсамольскіх камітэтаў факультэтаў (заўважу, што іменна іх артыкулы звычайна вызначаюцца дзелавітасцю, канкрэтнасцю), дык на хімфаку гэтае кола чытачоў нібыта імкнецца мець з рэдакцыяй «Хіміка» як мага меней спраў. Такая безыніцыятыўнансць ускладняецца тым, што ніхто з членаў рэдкалегіі не мае магчымасці прысутнічаць на пасяджэннях партбюро, а значыць, газета застаецца без неабходнай інфармацыі. Яшчэ больш гэта незразумела пасля таго, як у пачатку снежня тое ж партбюро факультэта вынесла рашэнне аб неабходнасці мець свайго пастаяннага карэспандэнта ў газеце. Але ў рэдакцыі гэтага карэспандэнта пакуль што не бачылі.

Каб насценгазета мела аўтарытэт, адпавядала свайму назначэнню, яна павінна быць змястоўнай. Перш-наперш гэта азначае, што ў кожным нумары павінны змяшчацца актуальныя матэрыялы. Тут патрэбна кіравацца неабходнасцю найбольш поўнага адлюстравання падзей, якія адбываюцца на факультэце. У сувязі з гэтым агульная заўвага: ні адна з рэдкалегій разглядаемых газет сваю трыбуну ў гэтым напрамку не выкарыстоўвае ў поўнай меры. У лепшым выпадку паяўляецца з левага боку газетнай старонкі інфармацыя аб пасяджэнні партбюро або камітэта камсамола. На гэтым «афіцыйная частка» нумара канчаецца, быццам і пісаць няма аб чым. Ні адна з рэдкалегій, напрыклад, ніяк не адгукнулася на падзеі першынства універсітэта па лыжных гонках, на выніку па мнагабор'ю ГПА, не падбадзёрыла сваіх спартсменаў, якія ўдзельнічалі ў спаборніцтвах. А між іншым, становішча на тым жа філфаку ў гэтым годзе склалася не лепшым чынам і заслугоўвае таго, каб пра гэта пагаварыць на старонках друку. Каманда філолагаў, выступаўшая, як вядома, у няпоўным саставе, заняла апошняе месца і па мнагабор'ю ГПА. А вось юрысты па многіх відах спаборніцтва сталі пераможцамі, але на факультэце іх так і не павіншавалі. Вядома, крыўдна...

Характэрна, што пытанню якасці ведаў адводзяць месца на сваіх старонках усе насценкі. Гэта зразумела, бо выдатная вучоба — галоўны абавязак студэнта. Але справа яшчэ і ў тым, як падаць такі матэрыял чытачам. Дзесяцігоддзямі адшліфаваныя довады на карысць сумленнай вучобы «качуюць» з газеты ў газету. Вывад такі: пакуль артыкулы будуць «тэарэтызаваць» на гэту тэму, пакуль вучоба не стане разглядацца ў газеце як частка сацыялістычнага спаборніцтва, пакуль будуць адсутнічаць канкрэтныя імёны і факты — размова пра выдатную вучобу не будзе вартай сябе самой.

Хацелася б сказаць некалькі слоў пра загаловак. Нярэдка над матэрыяламі можна бачыць надакучлівыя, проста нецікавыя загалоўкі. Вопыт сведчыць: разглядаючы свежы нумар газеты, чытачы ў першую чаргу звяртаюць увагу на фотаздымкі, потым на малюнкі, пасля на загалоўкі і ужо ў апошнюю чаргу на тэкст. Таму трапны загаловак, які кідаецца ў вочы, абавязкова прыцягне ўвагу чытача, выкліча ў яго жаданне азнаёміцца са зместам артыкула, і, наадварот, няўдала выбраны, ён не выклікае такога інтарэсу: чытач у лепшым выпадку прабяжыць яго вачыма, а самой карэспандэнцыяй не зацікавіцца. Загаловак павінен быць лаканічным, вострым, вобразным. Практычна заўсёды яго можна ўзяць з тэксту самога артыкула, акрамя гэтага, у рэдкалегіі маецца цэлы арсенал прыказак, прымавак. Трэба часцей звяртацца да гэтага скарбу.

Газета павінна быць не толькі змястоўнай, але яшчэ і знешне прываблівай, граматна скампанаванай. Калі, скажам, не надаваць значэння правільнаму размяшчэнню матэрыялаў, а раскідаць іх па ўсёй газеце без уліку вартасці, дык можа атрымацца, што малазначныя замалёўкі будуць у цэнтры ўвагі, а важныя артыкулы апынуцца ў канцы газеты. Дарэчы, так атрымалася ў хімфакаўскай насценкі.

Звярстаць правільна газету для чалавека, не знаёмага з «кодэксам» газетнай графікі,— справа нялёгкая. Вядома, што няма нейкіх строгіх законаў і норм, якія б вызначалі памеры артыкулаў у газеце. Але лепей, калі яны займаюць невялікую плошчу: так іх хутчэй прачытаюць, ды і аўтарам лягчэй напісаць невялікую заметку.

У адной з рэдкалегій мяне спыталі: ці можна дапускаць крытыку ў святочных нумарах насценгазеты? Наконт гэтага ёсць наступнае меркаванне: калі зыходзіць з таго, што крытыка псуе настрой, дык яе ў святочных нумарах патрэбна раз і назаўжды забараніць. Але ж крытыка існуе ў нас не для таго, каб зневажаць людзей. Святочны нумар насценгазеты павінен не толькі займацца прапагандай поспехаў, але і заклікаць людзей не супакойвацца на дасягнутым, ісці наперад. А выкрыццё і пазбаўленне ад недахопаў лепш за ўсё забяспечвае такі рух. Таму крытычныя матэрыялы ў святочных выпусках вельмі нават да месца.

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**наш спец. кар.**



# Ружовы ранак

літаратурная старонка

**Святлана РАМАНАВА,**
студэнтка журфака

* * *

Вясна. Цяплынь. Клякоча
зноўку бусел.
А потым доўга кружыць над
сялом.
Ляцяць дадому жураўлі
і гусі,
Махаючы прытомлена
крылом.

Абмытыя чысцюткія нябёсы
Кідаюць позірк ў плынь
вясновых вод,
Прачнуўся сок у срэбраных
бярозах,
Што водзяць каля рэчкі
карагод.

А ветрык дакранецца
да галінкі
I адарве пупышку ці сучок—
На ранцы ўмомант набяжыць
слязінка
I цяжка капне на сухі лісток.

Шчэ дождж залаты
не казытаў пагоркаў,
Зямля пад сонцам сохне,
аж дыміць,
I водар лісцяў, леташніх,
пагорклых,
У паветра з промнем
сонечным бруіць.

Цыбаты бусел на аднойназе
Стаіць ў буслянцы, што на
старым дубе,
Глядзіць цікаўна зверху
на людзей
I неяк дзіўна водзіць доўгай
дзюбай.

Задумаўся, відаць, разумны
птах.
Глядзіць сур'ёзна ўдаль,
не зварухнецца...
Аб чым жа ён раздумвае
вось так?
Аб чым маленькае клякоча
сэрца?

Ці радасна яму і хочацца
спяваць,
I клічуць ў неба сонечныя
крылы?
Напэўна так, бо вунь сюды
ляцяць
Буслы да бацькі, ў кут свой
родны, мілы.

Які палёт у іх, крыла
размах!—
Жывыя, непаўторныя
хвіліны...
I бусел пачынае клекатаць,
Спяваць бадзёра, весела,
шчасліва.



**Алесь ЦВЯХ,**
выпускнік журфака

## ДВОЕ

Р.
Плаўна плешчуць прылівы
вады.
Па цячэнню сплывае лістота.
Лес асенні — жывая істота—
ціха шэпча, як быў маладым.

Дзве дарогі — два крылы ў
жальбе.
Вось мая, побач ўецца
другая.
Як я жыў без цябе, дарагая,
і як буду я жыць без цябе?..

Пераблытаны, нібы сон,
гарады, расставанні,
сустрэчы...
Ёсць на свеце дзівосныя
рэчы,
калі думкі — ва унісон.

Пошласць сыта ашчэрыцца
ўслед.
Ты ідзеш да мяне, як святая.
Заінелы мой позірк адтае.
Замігціць чыстым золатам
свет.

Іхні смех — як у вока асцё.
Вершы—марнае намаганне...
Без паэзіі гіне каханне.
Без кахання жыццё — не
жыццё.
Тайны сэнс звыклых рэчаў
відзён
нам з табою ясней год ад
году.
Мудрым шэптам прарочыць
прырода
будні сумныя будучых дзён.

I пакуль крык гарачай крыві,
радасць стрэч і бяссонныя
ночы
ёсць у сэрцах, якія аднойчы
так салодка апёк боль
любві, —

прагна п'ём мы асенні азон,
п'ём каханне, як мёд дзікай
мяты!
Ёсць на свеце кароткія святы,
калі сэрцы — ва унісон.

Страціць гэта — лепш золата
страць.
З-за кахання знікалі народы.
...ясным шэптам прарочыць
прырода
першы снег
I апошнюю страсць...



## СЛАВЯНСКІ ЭЦЮД

Узоры гор зара разбіла,
пурпур успыхвае раз-пораз.
У хлеве пеўні на насціле
спрасонак пробуюць свой
голас.

Ноч цёмная зышла за
ўзлесак.
Прыносіць сонца людзям
весці,
што хутка лісцікі пралесак
вясну павінны ім прынесці.

Ярыла! Ярка свеціць-грэе
твой лік святы па-над
зямлёю!
I ўсё жывое млосна млее,
-абліта ласкай залатою.

Па дровы бацька з сынам
едзе,
Запрогшы ў санкі
сіўку-бурку.
А там, далёка ў лесе нейдзе
Шукае любага Снягурка.

## ВЕРА

Вокны глядзяцца ў сад.
Яблыні, як нявесты,
светла стаяць у рад,
майскаму рады фэсту.

Елак цяньшаньскіх сінь.
Крочым з табой у неба.
Так чалавеку трэба —
хлеба, відовішч,
вяршынь.
Вечная цішыня.
Гордая, ты збялела?
Проста — як птушка, цела.
Горная ж вышыня.

Верыцца ў чысціню,
гэту, як у паветры.
Выветраць з сэрцаў ветры
неразумення сцяну.

Бачым у добры час
скалы, у даліне — поле...
Горы і гора болей
не напужаюць нас.

Верачы ў цяплынь,
выкінем з душаў скруху.
Верачы толькі руху, —
мы дасягнём вышынь.

**Валянціна МІСЮК,**
студэнтка філфака

## ДРЭВЫ І ПТУШКІ

Дрэвы і птушкі...
Зялёная мроя
Цягне далоні
Да трапяткога
Шчасця высокага
I незямнога.
I ранак золкі,
Халодна-росны,
Шэпча: «Забылі
Свае вы гнёзды».
Ад смеху падаюць
З неба зоркі
У гнёзды птушак,
На ранак золкі...
Дрэвы хочуць
Быць птушкамі.

**Уладзімір СЯМЕНЧЫК,**
студэнт журфака

Н.
Нет ничего.
Кроме огня.
Кроме дождя
искр золотых.
Нет ничего.
Кроме меня.
Кроме тебя
в мыслях моих.
Гаснет огонь.
В зареве дня
краток полет
искр золотых.
Нет ничего.
Кроме меня
где-то вдали
в мыслях твоих.

**Людміла ДЗЕМІДЗЕНКА,**
студэнтка гістфака

* * *

Пляшут солнечные блики,
Льются солнечные звуки,
Протянуло небо руки
Лепестками повилики.

И сверкает бездной вечной,
А земля, вздохнув глубоко,
Устремляет бесконечно
В глубь небес живое око.

* * *

С тихим плеском упала
в море
Золотая звезда заката,
Затерялась в его просторе,
Ослепила угря и ската.

Электрических брызг потоком
Отразили морские рыбы
Золотые лучи, глубоко
Пронизавшие ил и глыбы.

Отразили—и стало тише,
И дремотой вода объята.
Улеглась под соленой крышей
Золотая звезда заката.

**Анатоль СЭНДЗЕР,**
студэнт журфака

* * *

Года все тяжелей,
Слова точней, весомей.
А завтра одолею
Былую невесомость,
И втайне усмехнусь,
Прочтя свой стих вчерашний,
Не потому что стал он пуст—
Глубинней жизнь пропашет.



**Віктар КУКЛОЎ,**
студэнт журфака

* * *

Мы купали в речке
лошадей...
Ты казалась самою красивой.
Лошади, потряхивая гривой,
Походили чем-то на людей.
Все казалось добрым и
родным.
Позабылись беды и печали.
Нам, таким веселым и босым,
Вслед деревья ветками
качали...
Улыбалась солнечно планета
В звуках удаляющихся гроз,
И неунывающее лето
Радуги вплетало меж волос.
В пору сенокоса и дождей
Мы тогда еще не знали сами,
Что под ржанье мокрых
лошадей
Пили счастье жадными
глотками...

* * *

Какие же мы умные
ПОТОМ.
Какие же мы нежные
ПОТОМ,
Когда свои ошибки осознаем.
Но почему об этом забываем,
Врываясь в сердце чье-то
напролом?..
Кому нужны объятия
ПОТОМ?
Зачем слова сочувствия
ПОТОМ,
Когда поправить что-то
невозможно?..
Но, может быть, ужасное в
другом,
На первый взгляд достойном
и надежном:
Стать мелкими и глупыми
ПОТОМ.
Стать черствыми и подлыми
ПОТОМ,
Когда вплелись корнями в
чьи-то души,
Обманутые верой и теплом,
Не вольные ничто уже
разрушить...

* * *

Колодец высох. Вот и позабыли...
Что может дать колодец без воды,
Затерянный в объятьях лебеды,
Покрытый мхом и придорожной пылью?
Не бьется больше сердце родника —
Что мог отдать — до капельки отдал.
А сам «журавль» напиться опоздал,
Не сделал ни единого глотка.
Слегка понуро шею опустил,
Скрипит вослед живому косяку.
В нем место бы нашлось и старику,
Но в деревянных крыльях мало сил.
И не поймет курлычащий косяк,
О чем грустит рассохшаяся птица,
Зовущая по-прежнему напиться,
Хотя колодец уж давно иссяк.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
7 красавіка 1983 г.
Зак 636. АТ 04150

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ